# ЭКСТРАННАЯ ДАПАМОГА

У надзвычайных сітуацыях, напрыклад, у выпадку смерці сваяка альбо знаёмага, затрымання, арэшта, дарожна-транспартнага здарэння, узнікнення пагрозы для жыцця грамадзяніна Беларусі звярнуцца ў Генеральнае консульства ў Беластоку неабходна па тэлефоне **+48 (85) 664 99 40**. Час працы – **з 8.00 да 17.00.**

У нерабочы час, а таксама ў выхадныя і святочныя дні з Генеральным консульствам Рэспублікі Беларусь у Беластоку можна звязацца:

па тэлефоне дзяжурнай службы Пасольства Рэспублікі Беларусь у Варшаве **+48 (22) 842 52 02** (кругласутачна);

па тэлефоне Генеральнага консульства Рэспублікі Беларусь у Беластоку **+48 (85) 664 99 40** з пераключэннем званка на тэлефон дзяжурнага консула.

Пры звароце трэба паведаміць прозвішча і уласнае імя, грамадзянства, адрас пражывання, тэлефон для сувязі, а таксама паведаміць падрабязна сутнасць звароту.

**<u>Дадатковая інфармацыя.</u>**

У выпадку ўзнікнення экстрамальнай сітуацыі, якая ставіць пад пагрозу жыццё, здароўе ці маёмасць, належыць звяртацца па тэлефоне **112 (адзіны нумар, які аўтаматычна выконвае падключэнне з аператарам экстрамальных служб, тэрытарыяльна размешчанных найбольш блізка да абанента).**

Хуткасць реагавання залежыць ад таго, якім чынам аператару паведамляецца інфармацыя аб здарэнні. У гэтай сувязі неабходна назваць сваё імя і прозвішча, сцісла апісаць сітуацыю і назваць месца здарэння. Гаварыць належыць выразна, па сутнасці адказваць на пытання аператара. Не раз'ядноўвацца з аператарам да таго часу, пакуль ён не дасць выразнае распараджэнне.

Экстранныя службы таксама вызываюцца па наступных тэлефонах:

**997 – паліцыя;**

**998 – пажарная служба;**

**999 – служба скорай медыцынскай дапамогі;**

**981 – дарожная дапамога;**

**986 – гарадская ахова** (ахова правапарадку ў грамадскіх месцах, ахова аб'екта грамадскага карыстання, кантроль дарожнага руху).